# Пунктуацыя

**1. Прачытайце тэкст. Вызначце, па якім прынцыпе (сэнсавым, граматычным ці інтанацыйным) пастаўлены знакі прыпынку.**

Якая прычына, што Максім Багдановіч застаецца для нас ледзь не самай сімпатычнай і роднай постаццю ў гісторыі беларускай літаратуры?

Па-першае, ён змагаўся наводдаль ад сваёй арміі. Іншым было лягчэй. Яны былі сузор’ем. Ён – самотнай зоркай, якая, вядома, бачыла святло ад вялікай галактыкі свайго народа і ад сузор’я лепшых сыноў яго, паплечнікаў сваіх – але ўсё ж палала наводдаль. Іншыя нарадзіліся ва ўлонні свайго народа, чулі ўвесь час яго мову, усмакталі яе з малаком маці і з вадою беларускіх крыніц. Гэты – чуў яе ад лічаных людзей. Ён большую частку свайго жыцця не бачыў радзімы, а калі ўбачыў, то спустошаную вайной, няшчасную, знявечаную і збрыджаную. Убачыў, каб адразу ж самотна памерці наводдаль ад яе.

Іншыя, можа, больш зрабілі. Але трагізм і веліч гэтага кароткага жыцця, пагрозная і шчымлівая яго нота – глыбей закранаюць наша сэрца. Мы супакутуем яму, і таму ён не толькі наш настаўнік, але і нібыта святло сэрца нашага, улюбёны сын, з нараджэннем якога мы пачалі новае жыццё, які зрабіў нас мудрэйшымі і лепшымі, адкрыў нам вочы на нас саміх, прымусіў па заслугах ганарыцца сабой.

І адышоў, не пакінуўшы нам суцяшэння.

Па-другое, гэты чалавек ніколі не зведаў кампрамісаў, ніколі не дапусціў сваё сумленне да згоды, не пісаў таго, чаго не думаў, цвёрда ішоў па адзіна магчымым для чалавека шляху, шляху годнасці і сцвярджэння права на сваю, адметную, незалежную думку. Без гэтага называцца чалавекам не мае права ніхто. І вось ён, незайманы, кінуў нас, астаўшыся ў сэрцах нашых найвышэйшым прыкладам такога вось Чалавека.

Па-трэцяе, ён бараніў годнасць чалавечую, клікаў да гуманізму і на гэтай дарозе адступленняў не ведаў.

Па-чацвёртае, Максім Багдановіч быў наскрозь гістарычным паэтам, у тым сэнсе, што абуджаў у народзе гістарычнае мысленне, а значыць, і гонар.

(У.Караткевіч)

**2. Спішыце сказы. Вызначце функцыі знакаў прыпынку (назавіце раздзяляльныя і выдзяляльныя знакі прыпынку). Растлумачце выпадкі спалучэння знакаў і “паглынання” адных знакаў другімі.**

1. Дружа, не будзь да аблудных бязлітасна строгі: то не віна, а бяда іх; бяду – не карай (Н.Гілевіч). 2. Вобразы мілыя роднага краю, смутак і радасць мая! Што маё сэрца да вас парывае? Чым так прыкованы я к вам, мае ўзгорачкі роднага поля, рэчкі, курганы, лясы?... (Якуб Колас). 3. Тры пісьменнікі не змаглі ў нас па-сапраўднаму разгарнуць свае крылы, не сталі тым, чым стаць маглі, – Багдановіч, Гарэцкі і Чорны (Я.Брыль). 4. Што б ні здарылася наперадзе за доўгі летні дзень, але раніца такая, што дзіця: прыносіць усмешку і радасць (І.Шамякін). 5. Скажыце, хлопцы, якая гэта

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

станцыя? (Якуб Колас). 6. На купінах каля пнёў, дзе каса не кранула травы (яе цяжка абразаць ля дрэва), застылі мокрыя ад расы блакітныя званочкі (Я.Брыль). 7. Гэй, ляці, маленства, рвіся ў люстраную даль (Янка Купала). 8. Андрэй узяў каптан і, сказаўшы: “Пабудзіш праз дзве-тры гадзіны, калі не здарыцца што незвычайнае…”, выйшаў з барака (П.Пестрак). 9. Даніла, вясковы пастух, – смелы чалавек (З.Бядуля). 10. Беларусь мая родная, як жа я рвуся яшчэ раз пеша ўсю цябе змераць!... (А.Куляшоў). 11. Ты скажы мне, цьма глухая: доўга будзеш ты ляжаць? (Якуб Колас). 12. Цяпер зноў чуваць, як чахкае сякера: дзядзька цярэбіць на зваленым дрэве галлё (Я.Брыль). 13. Вочы маці! У доўгія зімнія ночы вы над намі вясёлымі зоркамі ззялі, вы ў нясцерпнай дрымоце зліпаліся, вочы, але ўсё ж усміхаліся нам, забаўлялі (Н.Гілевіч). 14. Мастацтва, на мой погляд, – гэта перш за ўсё пачуццё, а затым ужо – думка (З.Прыгодзіч). 15. Чалавек, які кахае, але не сустрэў узаемнасці, падобны на таго жураўля, што выбіўся з сіл, адстаў ад выраю, застаўся адзін сярод шэрых, панурых купін балота, сам-насам са сваім болем, пякучаю крыўдаю, са сваёй горкай і надрыўнай песняй (З.Прыгодзіч). 16. Таго ніколі не пакіне юнацкі, вечна весні ўздым, хто аддае, як дар краіне, жыццё дарэшты – маладым! (Н.Гілевіч).

**3. Спішыце тэксты. Пастаўце знакі прыпынку і растлумачце іх ужыванне.**

І. З пачатку XVI стагоддзя Нясвіжам валодалі князі Радзівілы. Многія прадстаўнікі гэтага славутага рода вызначыліся і на ратным полі і на ніве культуры. Так адзін з іх Мікалай Крыштаф Радзівіл Сіротка (мянушку яму прыдумаў вялікі князь і кароль Жыгімонт Аўгуст) у 1582 – 84 гадах здзейсніў паломніцтва ў Іерусалім пасля чаго напісаў па-лацінску “Перэгрынацыю…” – кнігу падарожных нататкаў якая шмат разоў перавыдавалася на розных мовах у тым ліку і па-беларуску. Менавіта Мікалай Крыштаф і запрасіў з Італіі архітэктара Джавані Марыя Бернардоні спраектаваць на месцы колішняга драўлянага магчыма спаленага непрыяцелем замка новы мураваны і непрыступны варты імені і становішча Радзівілаў. Праз некалькі гадоў на правым беразе ракі Ушы акаймаваная з усіх бакоў шырокім ровам-возерам паўстала магутная крэпасць. Дарога да яе вяла па доўгім драўляным мосце які пры неабходнасці хутка разбіраўся.

Нясвіжскі замак вытрымаў нямала суровых выпрабаванняў. Цэлае стагоддзе ён лічыўся ці не самым дасканалым і ўмацаваным на Беларусі. Толькі ў маі 1706г. войска Карла XII здолела ўзяць штурмам Радзівілаўскае гняздо. Абарончыя бастыёны шведы ўзарвалі маёмасць разрабавалі.

Мясцовыя дойліды пасля неаднойчы адбудоўвалі і перабудоўвалі замак. І ўрэшце ператварылі яго ў дзівосны архітэктурна-паркавы ансамбль. Асабліва ўражвае сам палац падобны на казку застылую ў цэгле і камені. І самавітая ўездная брама нібыта ўрослая ў зямлю і высокія вежы што імкнуцца ў неба і велічныя залы дзе міжволі спыняешся са сцішаным сэрцам усё тут дыхае жывой мінуўшчынай і прымушае задумацца пра будучыню Радзімы. Даўно на чужыну вывезены старадаўнія даспехі карціны летапісы

кнігі слуцкія паясы… Але ніхто не здолеў вывезці як незлічонае золата-срэбра несмяротны дух Чорнай дамы што і па сённяшні дзень блукае ў палацы  дух каралевы Барбары Радзівіл атручанай хцівымі зайздроснікамі што не зведалі шчасця сапраўднага кахання. Дзесьці ў падзямельных лёхах-тайніках ужо два стагоддзі хаваюцца ад людскіх вачэй 12 срэбраных апосталаў. Іх шмат разоў шукалі аматары лёгкай нажывы кажуць нават зусім нядаўна. Дарэмна намагаюцца. Апосталы вернуцца самі калі адчуюць што ніхто і нішто ім не пагражае а на Беларусі іх сапраўды чакаюць.

(У.Ягоўдзік)

II. У полі было куды халадней чым у лесе. Насустрач дзьмуў пругкі не моцны але марозлівы вецер ад яго болем заходзіліся скалелыя без рукавіц рукі. Як Сотнікаў ні хаваў іх то ў кішэнях то ў рукавах то за пазухай усё роўна мерзлі. Памарозіць было надта проста асабліва твар і рукі. За ногі ён быў спакайнейшы ногі па хадзе грэліся. Праўда на правай адняліся не чуваць стала два пальцы але яны адымаліся заўжды ад сцюжы і звычайна балелі ў цяпле.

Добра хаця што снег у полі цвёрды і неглыбокі яны ішлі амаль скрозь па версе толькі мясцінамі правальваліся то адной то другой нагой ламаючы зацвярдзелую ад марозу скарынку. Кіравалі па быльняку па-над узмежкам. Ззаду са змроку валакліся два шнуркі іхніх слядоў. У полі было відней чым у лесе шэры прывідны змрок расхінаўся шырэй наўкола ў доле трымцелі на ветры змерзлыя дрэўцы. Праз чвэрць гадзіны наперадзе мусіць у лагчынцы зашарэла нейкае кустоўе лаза ці які хмызняк па-над рачулкай.

Сотнікаў адчуваў сябе вельмі кепска пачынала кружыцца галава часам нават штосьці правальвалася знікала ў памяці і тады на кароткі час ён забываўся дзе ён і куды ідзе. Мусіць сапраўды трэба было вярнуцца або лепш зусім не патыкацца з лесу ды ён проста не верыў што можа захварэць. Яшчэ чаго не хапала на вайне  хварэць!

(В.Быкаў)

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ